калгасных майстроўнях, куючы разам зь мільёнамі суайчыньнікаў інакшую, нечуваную на сьвеце долю. Былі *лепшае будучыні кавалямі*. І так ад *кавальства* даўнейшага адступіліся, але й шчасьця супольнага не прычакалі. Застаюцца цяпер, пры канцы стагодзьдзя, на нашай выбоістай беларускай дарозе, дзе так няпроста стаць *кавалём свайго шчасьця*.

# Каваль

***Сяржук Сокалаў-Воюш***

*Каваль* — адна з самых таямнічых, спавітых легендамі, казкамі й забабонамі асобаў. *Каваль* быў чарадзеем, чалавекам, які вырабляе з агнём і жалезам тое, што ня можа зрабіць хто заўгодна.

Магію *кавальства* адчулі бальшавікі, якія ўклалі ў рукі рабочага-малатабойца *кавальскі* молат і намовілі яго разьбіваць ланцугі рабства. „*Кавалі*“ — купалаўскі пераклад песьні „Мы кузнецы, и дух наш молод“, якая так і не загучала ў беларускім варыянце. Надта ж не стасуецца, у параўнаньні з кузьняцом, вобраз *каваля*, які куе ключы шчасьця. „*Каваль*“ — яшчэ адзін пераклад Купалы, але ўжо з польскай, дзе заміж гультайскіх прымройных ключоў гаворка ідзе пра нялёгкую, але ўзьнёслую працу і стаўленьне да гультаёў.

Слова *каваль* паходзіць ад дзеяслова *каваць*, які ёсьць у славянскіх, балцкіх і нават лацінскай ды ірляндзкай мовах. *Кавальства*, *кавальня*, *кавадла*, *падкаваць*, *падкова* — словы аднаго гнязда. „*Сам гартаваны, як меч на кавалдзе паходнай*“ — пісаў пра Вітаўта Вялікага Мікола Гусоўскі. „*Каваль*-ваявода“ — п’еса Еўсьцігнея Міровіча. „*Кавалі*“ — народны танец. Павал і Дзьмітры *Кавалёвы* — пісьменьнікі. Уладзімер *Кавальчук* — сьпявак. Міхал *Кавальчык* — рэжысэр. Аўгіньня *Кавалюк* — паэтка. Віктар *Каваленка* — празаік. Соф’я *Кавалеўская* — фальклярыстка, а ейная аднайменьніца — першая ў сьвеце жанчына-прафэсар. Уладзімер *Кавалёнак* — касманаўт. Сяргей *Кавалёў* — праваабаронца. Сьпіс можна доўжыць да бясконцасьці.

У сярэдзіне 80-ых *кавальства* як аднаасобная праца пачало адраджацца. Новы *каваль* — перадусім мастак, які ня толькі і падкову зробіць, і каня *падкуе*...

# Кавярня

***Алег Дзярновіч***

Гэтае месца заўжды лёгка пазнаць. Водар *кавы*, нягучная гамонка, ніхто нікуды не сьпяшаецца.

У XX стагодзьдзі *кавярні* станавіліся легендамі культураў. У першай палове стагодзьдзя ў парыскай „Ратондзе“ стала зьбіраліся вядомыя літаратары, у віленскім „Чырвоным Штралі“ рэгулярна сыходзіліся нашаніўцы. Праская „Славія“ ў 60–70-х гадох была слынным дысыдэнцкім асяродкам.

У Беларусі ўсё ж бракавала традыцыяў *кавярняў*. Іх папросту было замала. Але беларускі горад прагнуў *кавярняў* як асяродкаў іншай рэальнасьці. У Менску на працягу 70–80-х андэграўнд ды вальнадумцы абіралі для сустрэчаў не заўжды самыя шыкоўныя *кавярні*, галоўнае, каб больш-менш хапала